**Гукаў** Сяргей Іванавіч // Памяць: Полацк : Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раенаў Беларусі / Укл. С.С.Чарняўская. - Мн. : БелЭн, 2002. — С. 802.

**ГУКАЎ СЯРГЕЙ ІВАНАВІЧ (**13.4.1969 г. ў Полацку – 11.7.1988). Воін-афганец. Нарадзіўся ў Полацку. У 1985 г. Сяргей скончыў 8 класаў Полацкай сярэдняй школы № 14, працаваў слесарам-сантэхнікам на Полацкім аўтарамонтным заводзе. У маі 1987 г. Полацкім аб'яднаным гарваенкаматам прызваны ў Савецкую Армію, накіраваны ў Туркестанскую ваенную акругу. З 3.11.1987 г. – у Афганістане. Службу праходзіў у вайсковай частцы палявая пошта 82869, радавы, стралок. Загінуў 11.7.1988 г. пры абароне дарогі, па якой савецкія войскі выводзіліся з Афганістана. Пахаваны ў в. Конны Бор Полацкага раёна. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.